# Вярба Вера
# (1942-2012)



Вярба Вера (сапраўднае імя Гертруда Пятроўна Сакалова (ў дзявоцтве — Маркава) — беларуская паэтэса, перакладчыца.

Нарадзілася 14 студзеня 1942 года ў вёсцы Высокі Гарадзец Талачынскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і службоўцаў. Бацька, Пётр Андрэевіч Маркаў, загінуў у 1941 годзе пад Смаленскам. Маці, Надзея Васілеўна Казлоўская, працавала інжынерам у Мінску.

У 1958 годзе Вера Вярба скончыла сярэднюю школу ў Мінску і паступіла на філалагічны факультэт БДУ, які скончыла ў 1964 годзе. Пасля атрымання дыплома піша ў часопіс “Маладосць” і ўладкоўваецца старшым інспектарам аддзела прапаганды літаратуры ўпраўлення кніжнага гандлю Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па друку. Сур'ёзная пасада і вымушае паэтку ўзяць псеўданім.

З 1972 года — літсупрацоўніца, потым загадчыца аддзела пісем і інфармацыі рэдакцыі газеты “Літаратура і мастацтва”, з 1977 года — пазаштатны карэспандэнт часопіса “Работніца і сялянка”, з 1980 года — у часопісе “Беларусь”. Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1964 года, выбіралася членам бюро секцыі паэзіі СП БССР. Жыла ў Мінску. Мела сына.

Вера Вярба — адна з яркіх прадстаўніц плеяды жанчын-паэтэс (разам з Е. Лось, Я. Янішчыц, Н. Мацяш, Т. Бондар, Р. Баравіковай, Г. Каржанеўскай і інш.), якія сваёй творчасцю аздобілі і ўзбагацілі беларускую літаратуру другой паловы XX стагоддзя.

Літаратурная творчасць.

Дэбютавала Вера Вярба ў 1958 годзе. З гэтага ж года пачалі публікавацца яе вершы ў друку (часопісах “Вясёлка”, “Бярозка”, “Маладосць”, і інш.). Ужо ў 1962 годзе выдалі першую кнігу паэтэсы “Вочы вясны”, якая была высока ацэненая крытыкамі. У 1964 годзе Веру Вярбу прынялі ў Саюз пісьменнікаў БССР. Адзін з вершаў — “Ручнікі” — з першага зборніка спадабаўся выкладчыку Полацкага педагагічнага вучылішча Мікалаю Пятрэнку і ён напісаў на гэтыя словы песню. “Ручнікі” пасля выканання самадзейным дуэтам з Лёзна – Тамарай Дзядковай і Валянцінай Альхоўскай — на рэспубліканскім конкурсе мастацкай самадзейнасці сталі вядомаю песняй, якая пазней увайшла ў рэпертуар “Песняроў” і зрабіла маладую аўтарку папулярнай на ўсю краіну. У 1965 годзе Вера Вярба падрыхтавала другі свой зборнік “Снежань”, але чытач яго так і не пабачыў.

Яшчэ адной яркай адметнасцю жаноцкасці ў творчасці Веры Вярбы стала тэма мацярынства. Невыпадкова, што трэцяя яе кніга – гэта зборнік вершаў для дзяцей “Пралеска” (1968г.). Яшчэ ў васямнаццацігадовым узросце паэтэса ўсведамляла, якое найвышэйшае шчасце для жанчыны – быць маці. Кранае сваёй пяшчотай верш з першай кнігі паэтэсы – “Дачцэ, якой яшчэ няма” (1960г.).

Рэалізаваўшы сябе як жанчына-маці, паэтэса адзін за другім “нараджала” кнігі вершаў: “Высакосны год” (1969г.), “Сіняя бухта” (1975г.), “Альфа” (1978г.), “Мая маленькая планета” (1982г.), “Яраслаўна” (1986г.). У 1976 годзе выйшла “Выбранае”, у 1987 годзе — кніжка выбранай паэзіі “Белыя пісьмы”, у 1995 годзе — “Апошні верасень”.

Ваенная тэма прадстаўлена ў паэзіі Веры Вярбы таксама і праз асэнсаванне гераічнага вобразу сваёй зямлячкі Веры Харужай, якой яна прысвячае некалькі твораў (“Веры Харужай”, “Харужай”, “Вера”, асобны раздзел з паэмы “Каліна” — “Прыпяць” і інш.).

Памерла Вера Вярба 15 ліпеня 2012 года.

## Дадатковы матэрыял аб жыцці і дзейнасці Веры Вярбы:


1. **Баравікова, Р.** Па рацэ часу — у вечнасць / Раиса Баравікова // Літаратура і мастацтва. — 2012. — 20 ліпеня. — С. 1.
2. **Барысава, Т.** Ручнікі над вярбою / Т. Барысава // Рэспубліка. — 2016. — 20 жніўня. — С. 11.
3. **Бельскі, А.** “Дажджлівых раніц пазалота…” : лірыка Веры Вярбы / Алесь Бельскі // Роднае слова. —2002. — № 1. — С. 5–9.
4. **Буторына, І.А.** Вера Вярба : асноўныя вехі жыцця і творчасці / Ірына Буторына // Пачатковае навучанне. — 2013. — № 4. — С. 79–80.
5. **Вярба Вера** // Беларускія пісьменнікі (1917-1990) : даведнік / [склад. А.К. Гардзінскі ; нав. рэд. А.Л. Верабей]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. — С. 112–113.
6. **Вярба Вера** // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. Т. 2 / пад рэд. А.І. Мальдзіса. — Мінск : БелЭн, 1993. — С. 68–72.
7. **Вярба Вера** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. Т. 4 / рэд. кал. : Г.П. Пашкоў і інш. — Мінск : БелЭн, 1997. — С. 391–392.
8. **Верба Вера** // В атмосфере художественного поиска и стилевого многообразия: творчество витебских литераторов во второй половине 1960-х — начале 1990-х годов : монография : в 2 ч. / А.В. Русецкий, Ю.А. Русецкий. — Витебск : ВГУ им. П.М. Машерова, 2012. — Ч. 2. — С. 72–84.
9. **Верба Вера** // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т.В. Белова [и др.]. — Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2010. — Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. — Кн. 1. — С. 124.
10. **Вера Вярба** // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна / рэдкал. : І.П. Шамякін [і інш.] ; мастак А.М. Хількевіч. — Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1988. — С. 641.
11. **Верба Вера** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.] / редкол. : Г.П. Пашков [и др.]. — Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2006. — Т. 2 : А–Герань. — С. 623.
12. **Вярба Вера** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.] / рэдкал. : Т.У. Бялова [і інш.]. — Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2011. — Т. 2 : Б–Г. — С. 458.

13. **Гайдук, С.** Пачатак з канца, ці Чаму Вера Вярба працягвае жыць у нашых сэрцах / Сяргей Гайдук // Літаратура і мастацтва. — 2012. — 24 жніўня. — С. 5.
14. **Гардзей, В.** Ручнікі паплылі ў вечнасць / В. Гардзей // Звязда. — 2012. — 18 ліпеня. — С. 7.
15. **Гарэлік, Л.М.** Вярба Вера / Людзміла Гарэлік // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / рэдкал.: І. Э. Багдановіч [і інш.]. — Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 1993. — Т. 2 : Верабей–Іваноў. — С. 68.
16. **Кавалеўскі, С.** Апошні ліст Вярбы / Сяргей Кавалеўскі // Народнае слова. — 2012. — 21 ліпеня. — С. 7.
17. **Карніловіч, Э.** “Ручнікі” пела ўся краіна / Эдуард Карніловіч // Наша Талачыншчына. — 2013. — 11 верасня. — С. 7.
18. **Падарожны, А.** Ручнікі Вярбы / А. Падарожны // Голас Сенненшчыны. — 2017. — 14 студзеня. — С. 6.
19. **Піскунова, Т.** Чароўная паэзія Веры Вярбы / Таццяна Піскунова // Зара (Бешанковічы). — 2017. — 17 студзеня. — С. 6.
20. **Поэтесса любви, лирики, материнства** // Моя Толочинщина: страницы истории / А. Шнейдер. — 2-е изд, с изм. — Минск : Бизнесофсет, 2006. — С. 135–136.
21. **Саламевіч, І. У.** Вярба Вера / Ірына Саламевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 1997. — Т. 4 : Варанецкі–Гальфстрым. — С. 391–392.
22. **Соколова, Г.П.** От поэзии до прозы / Гертруда Соколова ; беседовала О. Кузьмич // Наша Талачыншчына. — 2012. — 14 студзеня. — С. 4.
23. **Шайтанава, Д.** На кожным кроку ў гэтым куточку жыве паэтычны радок / Д. Шайтанава, С. Гвоздзева // Наша Талачыншчына. — 2019. — 27 красавіка. — С. 10 ; 4 мая. — С. 9 ; 11 мая. — С. 5 ; 18 мая. — С. 4.

## Інтэрнэт-рэсурсы:

1. **Вера Вярба** : [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://be.wikipedia.org/wiki/Вера_Вярба. — Дата доступу : 28.10.2022.
2. **Вера Верба и женский мир ее поэзии** : [Электронный ресурс]. — Режим доступа : https://nlb.by/content/news/po-stranitsam-belorusskogo-kalendarya/vera-verba-i-zhenskiy-mir-ee-poezii/. — Дата доступа : 28.10.2022.
3. **Вярба Вера** : [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://pridvinie.vlib.by/index.php/mtree-lib/pismenniki-paety-litaratary/vyarba-vera. — Дата доступу : 28.10.2022.
4. **Нашчадкам пакінула вершы** : [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://www.natal.by/2012/07/20/нашчадкам-пакінула-вершы/. — Дата доступу : 28.10.2022.